

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1995
ЛІПЕНЬ
31
ПАНЯДЗЕЛАК
№ 112/ 1041
Цана 400 рублёў

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ — У МІНСКУ

Святкаванне Дня Незалежнасці 27 ліпеня традыцыйна пачалося з ускладання вянкоў на плошчы Перамогі ў Мінску. Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір, Старшыня Вярхоўнага Савета Мечыслаў Грыб, іншыя афіцыйныя асобы. Беларускую Праваслаўную Царкву на цырымоніі прадстаўляў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Масавае гулянне ў гонар Дня незалежнасці прайшло 27 ліпеня ў сталічным парку культуры і адпачынку імя Горкага. «Зямля пад белымі крыламі» — так называлася гэта свята.

Адзначыла нацыянальнае свята і апазіцыя. На ўрачыстым мітынгу, праведзеным у парку імя Янкі Купалы, выступалі як прадстаўнікі БНФ на чале з Зянонам Пазняком, так і вядомыя дзеячы беларускай культуры.

ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ В ЛИЦАХ

Издательство «Белорусская энциклопедия» выпустило уникальное издание «Мысліцелі і асветнікі Беларусі».

Ведущий научный редактор издательства, составитель книги Геннадий Маслыка рассказал: «Это одна из последних книг, которая вышла в нашем издательстве при жизни Бориса Саченко. Более семи лет известные специалисты страны, научные редакторы нашего издательства работали в польских, белорусских, русских архивах и библиотеках, изучали документальную, историческую, научную литературу. Одним словом, по крупицам собирали материал для этой книги».

Издание имеет четыре раздела: «Эпоха Полоцкого и Туровского княжеств» (X-XII вв.), «Эпоха Великого Княжества Литовского» (XIII-XVI вв.), «Эпоха Речи Посполитой» (XVII-XVIII вв.) и «Беларусь в составе Российской империи» (XIX в.).

Всего в алфавитном порядке в книге представлено более 650 исторических персоналий — известных и малоизвестных широкому кругу читателей имен. В энциклопедию также включены фрагменты из трудов мыслителей.

Евгений КРИЦКИЙ.

ЗАРПЛАТА НЕ АДСТАЕ АД РАСХОДАЎ

Як паведаміла Міністэрства статыстыкі і аналізу, грашовыя даходы насельніцтва рэспублікі за першае паўгоддзе гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага ўзраслі ў 13,3 раза. У той жа час спажывецкія расходы на набыццё тавараў і аплату паслуг у параўнанні са студзенем-чэрвенем мінулага года ўзраслі ў 13,1 раза.

Асноўная крыніца даходаў большай часткі насельніцтва па-ранейшаму — заработная плата. Сярэднемесячная заработная плата з улікам сацыяльных і працоўных выплат і матэрыяльнай дапамогі ў студзені-чэрвені склала 301 тысячу рублёў. Што да зарплаты ў чэрвені, то, па ацэнцы спецыялістаў, яна павінна скласці каля 800 тысяч рублёў. У той жа час цэны на спажывецкія тавары і паслугі з пачатку года ўзраслі ў 2,7 раза, у тым ліку на 21,4 працэнта пасля апошняга перагляду мінімальнай заработнай платы.

Цэны на харчовыя тавары за месяц павялічыліся ў цэлым на 2,1 працэнта.

БЮДЖЭТНЫ ДЭФІЦЫТ БЕЛАРУСІ

Бюджэтны дэфіцыт за 5 месяцаў гэтага года склаў 1,8 працэнта да валавога ўнутранага прадукту.

Па стану на 1 чэрвеня ў рэспубліцы было 1.930 стратных прадпрыемстваў і арганізацый, г.зн. 22,5 працэнта ад колькасці ўлічаных. У асноўным, гэта прадпрыемствы гандлю, грамадскага харчавання і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, прамысловасці і будаўніцтва.

Дэбіторская запазычанасць у цэлым па рэспубліцы на 1 ліпеня гэтага года склала 31,1 трыльёна рублёў, крэдыторская — 41,1 трыльёна рублёў.

86,5 працэнта дэбіторскай і 76 працэнтаў крэдыторскай запазычанасці — гэта запазычанасць за тавары, выкананыя работы і аказаныя паслугі. Грашовыя сродкі, якія маюцца на рахунках прадпрыемстваў, пакрываюць крэдыторскую запазычанасць толькі на 4,2 працэнта.

Запазычанасць беларускіх прадпрыемстваў гаспадарчым суб'ектам краін СНД і Балтыі перавышаюць запазычанасць прадпрыемствам рэспублікі на 4,3 трыльёна рублёў. Пры гэтым больш усяго — каля 94 працэнтаў — беларускія прадпрыемствы запазычылі расійскім пастаўшчыкам і спажыўцам прадукцыі.

Да канца першага паўгоддзя, паводле звестак Мінстата, падзенне курса беларускага рубля чакалася ў памеры 5 працэнтаў у месяц. Фактычна ж з 5 красавіка ён заставаўся стабільным і складаў 11,5 тысячы беларускіх рублёў за 1 долар ЗША.

Сальда знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь — адмоўнае і складае 3,5 трыльёна рублёў (274,4 мільёна долараў ЗША). Пры гэтым, калі з краінамі СНД сальда адмоўнае і складае 5,5 трыльёна рублёў, то з краінамі далёкага замежжа — станоўчае і складае 2 трыльёны рублёў.

Ірына САЗАНОВІЧ.

КУРС ОБМЕНА наличной валюты в коммерческих банках на 31 июля 1995 г.

Наименование банка	Доллар США покупка	Доллар США продажа	Немецкая марка покупка	Немецкая марка продажа	Российский рубль покупка	Российский рубль продажа
БЕЛАРУСБАНК	11500	11750	8000	8330	2.2	2.5
БЕЛБИЗНЕСБАНК (гл. оп. упр.)	11400	11600	8000	8300	2.25	2.6
БЕЛБИЗНЕСБАНК (гор. дирекция)	11500	11800	8250	8500	2.35	2.6
БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК	11450*	11700	8270*	8450	2.2	2.6
БЕЛИНВЕСТБАНК	11450	11750	7900	8400	2.3	2.6
ФК "ВЕРОНИКА" ***	11580*	11820*	8280*	8600*	2.51*	2.7*
ДУКАТ	11400*	11800	8100*	8500	2.4*	2.7
ИНТЕК	информация на 9.50 не получена					
Ф-л МИЛАВИЦА АКБ ДУКАТ	11500	11800	8100	8300	2.2	2.7
НАРОДНЫЙ БАНК	11520	11750	8100	8380	2.40	2.5
ПРИОРБАНК	информация на 9.50 не получена					
СБЕРБАНК	11500	11750	7950	8250	2.15	2.45
ОЛИМП	информация на 9.50 не получена					
ЭЛИТБАНК	11450	11850	8100	8350	2.35	2.55
Ф-л НЕМИГА АКБ ДУКАТ	информация на 9.50 не получена					
Филиал №1 АКБ ОЛИМП	11300*	11650*	8000*	8200*	2.2*	2.45*

* Возможна операция за наличный и безналичный расчет

** Операция проводится только по безналичному расчету

В течение дня курсы могут меняться, курсы головного управления банков могут несущественно отличаться от курсов, установленных в обменных пунктах.

Информация (на 9 час. 45 мин.) подготовлена "Агентством Грецова".

	Доллар США	Немецкая марка	Российский рубль
НАЦИОНАЛЬНЫЙ БАНК (официальный курс для б\н расчетов)	11500	8303.25	2.55

БЕЛАРУСЬ ЗДОЛЕЕ ЗАНЯЦЬ ГОДНАЕ МЕСЦА Ў СУПОЛЬНІЦТВЕ ДЗЯРЖАЎ

З выступлення прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра на ўрачыстым пасядженні, прысвечаным 5-й гадавіне Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі быў нададзены статус Асноўнага Закона. Гэтыя палажэнні замацавала прынятая ў мінулым годзе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, у якой наша краіна аб'яўлена дэмакратычнай, сацыяльнай і прававой дзяржавай.

Канстытуцыя прадугледжвае ўсталяванне моцнай прэзідэнцкай улады, і гэта патрабаванне асноўнага закона ажыццёўлена на справе.

У выніку першых у гісторыі нашай краіны свабодных, сапраўды дэмакратычных выбараў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь стаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. На мінулым тыдні спoўнілася гадавіна яго ўступлення на пасаду кіраўніка дзяржавы і пачатку дзейнасці ўрада пры Прэзідэнце. Таму, мне здаецца, ёсць падстава сёння хаця б вельмі сцісла сказаць аб выніках зробленага за гэты час.

Перш за ўсё трэба адзначыць тую вялікую працу, што была здзейснена па дзяржаўнаму будаўніцтву, усталяванню нашай дзяржавы як суверэннай і незалежнай. Нарэшце пакладзены канец безадказнасці і бяссіллю ўладных структур. Створана прэзідэнцкая вертыкаль. Сёння кожная ступень улады ведае, што ёй рабіць і за што канкрэтна яна адказвае. Гэта дае падставы для ўпэўненасці ў тым, што як эканамічныя, так і сацыяльныя пераўтварэнні пойдуць на Беларусі больш актыўна.

У ліку важнейшых накірункаў дзейнасці Прэзідэнта і яго ўрада былі і застаюцца клопаты аб павышэнні эфектыўнасці ўдзелу дзяржавы ў эканамічным працэсе.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару, па асноўных паказчыках мы выйшлі на ўзроўні, што былі вызначаны Праграмай неадкладных мер па вываду эканомікі рэспублікі з крызісу.

Не збыліся прагнозы тых эканамістаў, якія прадказвалі поўны развал нацыянальнай эканомікі. Хаця цалкам спыніць зніжэнне вытворчасці пакуль што не ўдалося, абвальнага спаду не дапушчана. Нягледзячы на тое, што сітуацыя застаецца складанай і вельмі супярэчлівай, у нас ёсць пэўныя станоўчыя вынікі.

У першым паўгоддзі бягучага года амаль шэсцьсот прадпрыемстваў, альбо кожнае трэцяе, нарошчвалі аб'ёмы вытворчасці. Гэта своеасаблівыя кропкі эканамічнага ўздыму.

Наша эканоміка паступова набывае новыя рысы. Яна пазбаўляецца ад той спадчыны, якая ёй у свой час дасталася, — ад нізкай тэхналагічнасці і высокіх затрат энергіі, працы, матэрыялаў і асноўных фондаў на адзінку прадукцыі. Прадпрыемствы ўсё болей прыстасоўваюцца да патрэб рынку. І гэта абнадзейвае.

У апошні час значна знізіліся тэмпы інфляцыі. Яна кантралюецца, прычым не адміністрацыйнымі, а эканамічнымі метадамі.

Сёння трэба адзначыць таксама ўмацаванне нацыянальнай валюты. Яе ўстойлівасць палажыла канец масавым спекуляцыйным здзелкам, стварыла глебу для развіцця здаровай эканомікі.

Узрос давер насельніцтва да беларускага рубля. У апошнія месяцы назіраецца пазітыўная тэндэнцыя павышэння рэальнай заработнай платы і грашовых даходаў насельніцтва.

Зразумела, пакуль што да поўнай стабілізацыі ў эканоміцы яшчэ далёка. Але ёсць упэўненасць, што мабілізаваўшы свае магчымасці, мы яе забяспечым.

Сёлета было шмат разважанняў наконт таго, што нашы сяляне не здолеюць правесці сяўбу. Аднак урад знайшоў магчымасць аказаць пэўную фінансавую і матэрыяльна-тэхнічную падтрымку вёсцы.

Мы добра разумеем, што працавітасць, цярплівасць і жыццёвая мудрасць беларускага селяніна цэментуюць наша грамадства. Таму я звяртаюся да ўсіх, ад каго залежыць лёс ураджаю, з заклікам і просьбай зрабіць усё магчымае, каб тое, што вырашчана, было сабрана і захавана.

Урад аказвае максімальна магчымую падтрымку і іншым галінам народнагаспадарчага комплексу, дзе праблем не менш, чым у вёсцы. Але сёння ўсім трэба хутчэй прыстасоўвацца да новых умоў гаспадарання.

Цяпер прадпрыемствы маюць стабільную валюту і поўную эканамічную свабоду. Застаецца вырабляць тую прадукцыю, якая патрэбна людзям, гандляваць ёю і атрымліваць у залежнасці ад колькасці і якасці працы.

Вядома, што гэта цяжка, асабліва з прычыны таго, што страчаны многія нашы традыцыйныя рынкі. Таму Прэзідэнт і ўрад імкнуцца дапамагчы прадпрыемствам усталяваць трывалыя гандлёвыя адносіны з новымі партнёрамі блізкага і далёкага замежжа.

Асабліва шырокую падтрымку і адабрэнне народа знаходзяць намаганні Прэзідэнта, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю Беларусі з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і ў першую чаргу з Расіяй і Украінай. Гэтая інтэграцыя дазволіць больш поўна выкарыстоўваць магутнасці ва ўсіх галінах нашай прамысловасці, лепш скаардынаваць намаганні вытворцаў прадукцыі, павялічыць занятасць.

Стварэннем мытнага саюза з Расіяй, заключэннем шэрагу ўзаемакарысных пагадненняў з Украінай упершыню зроблены прыкметны крок наперад на шляху пераходу да рэальнай інтэграцыі эканомік нашых краін.

За апошні час пашырылася наша ўзаемакарыснае супрацоўніцтва не толькі з краінамі-суседзямі. Вельмі плённымі былі перамовы кіраўніцтва рэспублікі са старшынёй Дзяржаўнага Савета Кітая Лі Пэнам, першым віцэ-прэзідэнтам Ірана Хасанам Хабібі, прэм'ер-міністрам Літвы Адольфасам Шляжавічусам, кіраўнікамі шэрагу іншых дзяржаў.

Вынікам гэтых сустрэч стане больш шырокае выкарыстанне магчымасцей Беларусі для знешняга гандлю і больш эфектыўнага выкарыстання пераваг міжнароднага падзелу працы.

Не апошняе значэнне мае і той вопыт, які назапашаны асобнымі краінамі ў вырашэнні праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Тут ёсць магчымасць шмат чаму навучыцца на чужых памылках, каб пазбегнуць сваіх.

Эканамічная палітыка, якую праводзіць ўрад пад кіраўніцтвам Прэзідэнта, знаходзіць станоўчы водгук у міжнародных фінансавых арганізацыях, і перш за ўсё, у кіраўніцтва Міжнароднага валютнага фонду.

З кожным новым этапам развіцця нашых кантактаў тут расце разуменне цяжкасцей і праблем, якія існуюць у эканоміцы рэспублікі.

І наогул, у сусветным супольніцтве павышаецца аўтарытэт Беларусі як краіны, што ў Дэкларацыі аб незалежнасці ў якасці галоўнай мэты сваёй знешняй палітыкі абвясціла нейтралітэт і ўсімі сваімі дзеяннямі імкнецца да гэтага.

Беларусы не ўдзельнічаюць у міжнародных і рэгіянальных канфліктах і сутыкненнях. А падзеі апошняга часу сведчаць, што гэта — вялікая заваёва, якой трэба не толькі ганарыцца, але і даражыць.

Для таго, каб хутчэй выйсці з крызісу, неабходна павысіць узровень кіравання вытворчасцю, палепшыць дзейнасць банкаў, агульнымі намаганнямі вырашыць праблему ўзаемных неплацяжоў і такім чынам паскорыць стварэнне ў рэспубліцы больш эфектыўнай гаспадарчай сістэмы.

Нам трэба яшчэ больш настойліва змагацца супраць марнатраўства ў выдаткаванні ўсіх відаў сыравіны, і перш за ўсё, энерганосьбітаў. Трэба не на словах, а на справе ўсім быць дбайнымі гаспадарамі.

Усё гэта павінна стаць праграмай дзеянняў не толькі Кабінета Міністраў, але і мясцовых органаў улады, усіх працоўных калектываў.

Сёння мы маем падставы лічыць, што горшае засталося ў мінулым. Але пакуль што людзі ў сваёй большасці яшчэ не адчулі перамен да лепшага. Такія перамены адбудуцца толькі тады, калі наша эканоміка стане на трывалую глебу, пачне па-сапраўднаму папраўляцца. Усім нам трэба прыкласці шмат намаганняў, каб гэта адбылося хутчэй.

Калі мы сапраўды хочам сабе дабрабыту, хочам жыць лепш, трэба кожнаму працаваць з большай адказнасцю, як кажуць, спаўна.

Трэба ўсюды наводзіць парадак, умацоўваць дысцыпліну. Мы павінны самым рашучым чынам пазбаўляцца псіхалогіі ўтрыманства, што ўкаранілася ў нашай свядомасці за многія гады. Нельга спадзявацца на тое, што хтосьці нам дапаможа. Трэба самім клапаціцца пра свой дабрабыт.

У Беларусі ёсць магчымасць забяспечыць устойлівае развіццё сваёй эканомікі, гарантаваць дастойнае жыццё ўсім сваім грамадзянам. Гэта наша галоўная мэта і наш святы абавязак.

Перакананы, што аб'яднаўшы нашы намаганні, мы абавязкова даб'ёмся поспеху, і наша незалежная краіна здолее заняць годнае месца ў супольніцтве дзяржаў і народаў.

ЭПИЗОДЫ ПРАЗДНИКА

В День Независимости Республики Беларусь 27 июля в выставочном комплексе «Минскэкспо» состоялся показ «Гобелена века» художника Александра Кищенко. Гобелен осмотрел Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко.





НА СНИМКАХ: Александр Лукашенко беседует с художником Александром Кищенко; фрагмент «Гобелена века».

Фото Евгения КОЗЮЛИ, БЕЛИНФОРМ.

КУЛЬТУРА

КНИГИ, ОПАСНЫЕ ДЛЯ ОБЩЕСТВА

С исчезновением государственной монополии на производство и распространение книжной продукции издатели самостоятельно определяют пути экономической и творческой деятельности.

С одной стороны, — констатируют в Министерстве культуры и печати Республики Беларусь, — это помогло вернуть читателям целые пласты культурно-образовательной, исторической, религиозно-духовной и художественной литературы. С другой стороны, коммерциализация издательской деятельности (особенно это касается негосударственных издательств) способствует появлению и некоторых социально опасных изданий. Так, на коллегии министерства такими изданиями были признаны серия «Презент» («Он», «Она», «Блеф»...) фирмы «Парадокс» и сборник детских страшилок «Мальчик в овраге нашел пулемет» (редакция журнала «Парус»).

В торговую сеть страны время от времени поступают и книги сомнительного содержания, которые приобретаются у издателей и фирм других стран. К таким книгам были отнесены «Русские заветные сказки» А.Афанасьева и сборник порнографических романов «11 тысяч палок».

Александр КАЗАК, РИД.

РАЗНОГЛАСИЯ — НЕ ПОМЕХА СОТРУДНИЧЕСТВУ

«Украина рассматривает Беларусь как независимое государство и во всех вопросах исходит только из этого», — заявил министр иностранных дел Украины Геннадий Удовенко.

По словам министра, Украина в настоящее время проводит активный внешнеполитический курс на углубление и расширение сотрудничества со странами Запада и европейскими структурами — Советом Европы и НАТО. «Но одновременно приоритетом номер один нашей внешней политики является нормализация и развитие отношений с Российской Федерацией, а также со всеми соседями Украины, что отвечает и требованиям Совета Европы», — подчеркнул Г.Удовенко.

Отвечая на вопрос, влияют ли на характер белорусско-украинских отношений различия в позициях двух государств относительно расширения НАТО на Восток, министр иностранных дел Украины сказал: «Каждая страна вырабатывает свое собственное отношение к международным проблемам, в т.ч. и к проблеме расширения НАТО. Позиция Украины, конечно, отличается от позиции Беларуси по этому вопросу, но не кардинально. Наши разногласия не мешают нам находить взаимопонимание».

Александр ПАТУТИН, РИД.

СООБЩЕНИЕ МИНТЕПЛОСЕТЕЙ

Для подготовки тепловых сетей города Минска к работе в зимних условиях в соответствии с утвержденным Мингорисполкомом «Графиком отключения теплосетей для испытаний и ремонтов» Минскими тепловыми сетями в августе 1995 г. будет отключено горячее водоснабжение:

вдоль улиц Ангарская (ж. д. 1-15, 2-84), Енисейская, пос. МАЗа (Центральная, Седова, Мичурина, Трудовая, Шоссейная), Днепровская, Летняя, Охотская, Нестерова (ж. д. 2-8), Байкальская, Алтайская, Герасименко (ж. д. 1-45), пр.Партизанский (ж. д. 105-149) с 7 августа по 28 августа;

вдоль улиц В.Хоружей, Кульман, Щедрина, Гая, Осипенко, Шевченко, Каховская, Кропоткина, Червякова, Орловская, Беломорская (ж. д. 1-17, 2-10), Карастояновой, Нововиленская, Варвашени, Куйбышева, М.Богдановича (ж. д. 33-147, 6-108), Сурганова (ж. д. 21-61, 52-86), Пугачевская, Киселева, Восточная (ж. д. 37), Гало (ж. д. 6, 4), Беды (ж. д. 3-27, 24), Некрасова (ж. д. 17-35), Я.Коласа (ж. д. 1-35, 2-36), пр. Скорины (ж. д. 51-71) с 21 июля по 24 августа;

вдоль улиц Есенина, Космонавтов, Рафиева (ж. д. 81 — до конца, 72 — до конца), Слободская, пр. им. газеты «Известия» (ж. д. 100-124) с 31 июля по 24 августа;

вдоль улиц Сухаревская, Горецкого, Шаранговича, Лобанка (ж. д. 89-105) с 31 июля по 1 сентября;

вдоль улиц М.Богдановича (ж. д. 1-27), Я.Купалы (ж. д. 27), Старовиленская (ж. д. 2-16), пер. Коммунальный, 3 с 31 июля по 16 августа;

вдоль улиц Харьковская, Берута, Гусовского, Скриганова, Д.Сердича, Жудро, Притыцкого (ж. д. 2-54, 3-17), П.Глебки, Матусевича, Л.Украинки, Ольшевского, Я.Мавра, Волоха (ж. д. 45-59), К.Либкнехта (ж. д. 110-130), Лермонтова (ж. д. 45-49), Карпова (ж. д. 12-16), Бельского, Пономаренко, пр. Пушкина, пр. Машерова (ж. д. 1-53), Немига (ж. д. 2-26), Короля, Сухая, Коллекторная, Раковская, Перекопская, Романовская Слобода, Тимирязева, пер. Мебельный, Танковая, Заславская, Мельникайте, Панфилова, Кальварийская с 7 августа по 9 августа.

В период испытаний возможны повреждения теплопроводов. При обнаружении течи горячей воды и парения из земли, камер и колодцев, провалов грунта вокруг камер и колодцев, нарушения их целостности необходимо срочно сообщить диспетчеру Минских тепловых сетей по тел. 21-15-85, 21-15-86.

Информацию о конкретных сроках включения горячего водоснабжения можно получить в ЖЭС по месту жительства.

Уважаемые минчане и гости столицы! Минские тепловые сети приносят извинения за временные неудобства, связанные с перерывами в горячем водоснабжении.

О возможных изменениях вышеуказанных сроков отключения горячей воды у потребителей, а также об отключении горячего водоснабжения в сентябре будет сообщено дополнительно.

Администрация Минтеплосетей.

ЕСТЬ ПРЕДЛОЖЕНИЕ

ВЫПУСКНИКИ ШКОЛ — НА РЫНКЕ ТРУДА

Трудоустройство слабозащищенных категорий граждан — одна из сложнейших задач службы занятости населения. И на первом месте — проблема трудоустройства выпускников школ.

Они, как правило, не имеют специальности, профессии. Многие порой не представляют даже, в какой сфере смогли бы приложить свои руки. Удостоверения, выданные после окончания курсов УПК, не имеют большого веса в реальной жизни. И начинать им приходится практически с нуля.

КЗоТ Республики Беларусь предусматривает для лиц от 16 до 18 лет рабочую неделю не более 36 часов. Эта льгота позволяет молодежи постепенно переходить к полноценной трудовой жизни и, естественно, направлена на защиту их здоровья. Однако, с другой стороны, предприятия не очень спешат принимать молодых людей на неполную рабочую неделю.

Именно эти две причины (отсутствие профессии, неполная рабочая неделя) осложняют возможность трудоустройства выпускников школ. Даже дополнительные гарантии занятости, разрабатываемые государственной службой занятости населения, не могут в полной мере гарантировать молодежи работу. Предприятиям, несмотря на предоставляемые льготы, утверждаемые Мингорисполкомом и исполкомами районных Советов, просто невыгодно да и нет возможности принимать выпускников. К тому же места, которые предоставляются предприятиями, зачастую непрестижные, низкоквалифицированные и низкооплачиваемые.

Один из выходов нам видится в смещении акцента организации рабочих мест на те предприятия, которые желают, но не могут предоставить работу. Существует множество малых предприятий, которые могли бы трудоустроить молодежь с условием предоставления им производственных помещений. К примеру, ММУПП «Саим» уже несколько лет не может найти помещение, чтобы организовать производственные цеха, в которых смогли бы работать старшеклассники и выпускники школ.

Около двадцати предприятий, которым доведена бронь исполкома местного Совета народных депутатов для трудоустройства выпускников школ, совместными усилиями могли бы арендовать производственные помещения и передавать их во временное пользование (к примеру, на год) малому предприятию на условиях договора о трудоустройстве выпускников школ. Они должны были бы обязательно получить работу на этих двадцати предприятиях. Перечисления предприятия за аренду помещения будут составлять двенадцать минимальных заработных плат за каждого трудоустроенного выпускника.

Молодые граждане заключат на год контракт, по истечении которого у них появятся практические навыки, специальность, уверенность в себе и т.д. К тому же многим из них исполнится к этому времени 18 лет, следовательно, исчезнет право на неполную рабочую неделю. Все это в значительной мере увеличит конкурентоспособность выпускников на рынке труда.

Если помещения удастся арендовать (возможно, на одном из этих же двадцати предприятий), то в августе-сентябре можно будет комплектовать группы выпускников школ и заключать договор об аренде помещений. Все организационные вопросы по осуществлению этого варианта вполне могли бы взять на себя государственная служба занятости населения.

Предлагаемый нами путь повышения конкурентоспособности выпускников школ имеет свои плюсы и минусы. И все же вероятно, это один из выходов из сложной ситуации с занятостью молодежи.

Станислав СОРОКА, главный специалист МГЦЗН.

ВЗГЛЯД



В МИНСКЕ — ЖАРА

Фото А.ДРОЗДОВА.

ПРОЕКТЫ

ЭКОНОМИТЬ, КАК В ЕВРОПЕ

На рассмотрение Кабинету Министров передан проект Национальной программы по энергосбережению, разработанный Комитетом по энергосбережению и энергетическому надзору совместно со специалистами Белорусского политехнического института.

— Потребность в такой программе вызвана прежде всего тем, — сказал заместитель председателя Комитета Александр Саванович, что при снижении, например, в прошлом году национального дохода на 21,8%, а валового внутреннего продукта — на 20,8% суммарное потребление тепла и энергии уменьшилось всего на 12%.

Александр Саванович подчеркнул, что стратегической целью политики энергосбережения является выход республики к 2010 году на уровень государств Европейского Союза по энергоемкости валового внутреннего продукта. Поэтому в программе четко очерчены основные направления и первоочередные меры по экономии энергии, тепла и воды.

— С 1 июля объем затрат на коммунальные услуги населения возрос до 60%. В этой связи почти закончена работа по адресному субсидированию тех граждан, расходы на оплату жилищно-коммунальных услуг у которых превысят 15% совокупного дохода семьи.

Если в отопительный период среднестатистическая двухкомнатная квартира обходилась в 113 тыс. рублей в месяц, то теперь — в 185 тысяч. В межотопительный период тариф такой квартиры поднимется с 56 до 99 тысяч, трехкомнатной зимой со 153 до 256, в летний период — с 71 до 128 тыс. рублей. По мнению правительства, это не только снизит нагрузку на производство, но и заставит экономить энергию самих квартиросъемщиков.

Специалисты прогнозируют, что уже к концу года население Беларуси станет оплачивать около 80% за потребляемую электро- и тепловую энергию. Хотя прогноз и не радует, рыночные законы требуют платить за услуги столько, сколько они стоят. Самое время подумать о повсеместной установке приборов учета — как в квартирах, так и на предприятиях и в учреждениях. Многие так и делают. Например, по инициативе Министерства образования и науки в вузах республики установлено 170 приборов учета тепла. Министерство здравоохранения предполагает в ближайшее время установить около тысячи счетчиков тепла в больницах, амбулаториях и поликлиниках республики.

Что касается квартиросъемщиков, то многие из них, реально оценив ситуацию, уже устанавливают в частных и кооперативных зданиях индивидуальные приборы учета тепла и воды. Тем более что еще год назад правительство республики приняло постановление о порядке компенсации их стоимости. В соответствии с ним, 75% стоимости счетчика может быть оплачено, если он установлен в этом году, 50 — в следующем и 25 — через год. Весной нынешнего года вышел аналогичный документ в Министерстве жилищно-коммунального хозяйства. Однако, обращаясь за компенсацией по месту жительства, граждане получают отказ: документ есть, а денег нет.

— Все дело в том, — пояснил заместитель председателя Комитета по энергосбережению и энергонадзору, — что выделить средства на эти цели должно Министерство топлива и энергетики. Однако до сих пор там находят «веские» причины, чтобы затормозить процесс.

Тереза ХАЮТИНА, «Нацыянальная эканамічная газета», № 30.

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. НАМ АДКАЗВАЮЦЬ

6 чэрвеня ў рубрыцы «Адпачынак — справа сур'ёзная» быў надрукаваны матэрыял «Ля самага сіняга мора». Рэйдавая брыгада, у склад якой увашлі супрацоўнікі Цэнтра санітарыі і эпідэміялогіі і нашай газеты, вырашыла высветліць: каму сёння добра адпачываецца ля сталічнага мора? Ці камфортна абстаўлены ўладамі наш адпачынак?

Відавочна, што былі выяўлены недахопы па ўладкаванню пляжаў і некаторыя іншыя.

Рэдакцыя атрымала адказ рэагаванне старшыні выканкама Фрунзенскага раёна Л.С.Матусевіча. Ён паведамляе, што «з прадстаўнікамі службаў прадпрыемстваў, адказных за ўтрыманне пляжаў, быў арганізаваны выезд у зону адпачынку для арганізацыі неабходных мерапрыемстваў па выпраўленню ўтрымання пляжаў.

На сённяшні дзень на ўсіх участках праведзены работы па паляпшэнню санітарнага і эстэтычнага становішча зон адпачынку».

Ірына ГЕРМАНОВІЧ.

АКТУАЛЬНО

БУДУТ ПЛАТИТЬ «ДОРОЖНЫЕ»

Отныне иностранные граждане — владельцы автотранспортных средств — за проезд по автомобильным дорогам общего пользования Республики Беларусь должны платить дорожный сбор.

Взимание сбора осуществляется при въезде на территорию Беларуси или выезде с ее территории в пунктах таможенного пропуска через Государственную границу Республики Беларусь. «Дорожные» можно уплатить как в СКВ, так и в белорусских рублях по курсу Нацбанка на дату платежа.

Надо отметить, что сбор не платят владельцы автотранспорта иностранных государств, доставляющие к нам гуманитарную помощь. Пока данная льгота распространяется только на них, но, по предложению заинтересованных министерств, режим наибольшего благоприятствования может устанавливаться и на другие категории автовладельцев. Ставки сбора зависят от вида транспортного средства, его вместимости или грузоподъемности. Так, за проезд через территорию Беларуси владельцы автобусов платят от 25 до 90$, грузового транспорта — 70-155$, а легковых автомобилей — 20-30$. За въезд на территорию Республики Беларусь ставки несколько ниже (соответственно 15-45$, 35-80$). Для владельцев легковых автомобилей ставки такие же, как и за проезд через территорию страны.

Сергей КУРКАЧ, РИД.

ЭКОНОМИКА

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ НЕ ЗА ГАРАМІ

Міністэрствам па кіраванні дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі ў бягучым годзе намечана прыватызаваць 1054 прадпрыемствы камунальнай уласнасці, у тым ліку 204 у Віцебскай, 128 — у Брэсцкай, 127 — у Магілёўскай, 318 — у Гомельскай, 54 — у Мінскай, 135 — у Гродзенскай абласцях, а таксама 89 сталічных прадпрыемстваў. Рэфармаванню падлягаюць у асноўным прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу (350), гандлю (250) і бытавога абслугоўвання (177), грамадскага харчавання (79), жыллёва-камунальнай гаспадаркі (71), прамысловасці (29), будаўніцтва 8) і іншых галін (69).

Ірына САЗАНОВІЧ, БелаПАН.

АКЦЫІ АКЦЫЯНЕРНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ — НА БІРЖУ

Міністэрства юстыцыі Беларусі зарэгістравала загад Міндзяржмаёмасці «Аб продажы каштоўных папер, якія належаць дзяржаве, на Беларускай фондавай біржы». У адпаведнасці з дакументам, Міндзяржмаёмасць прыступае да арганізацыі продажу акцый за грошы і імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць». Для продажу на біржы ў першую чаргу будуць выстаўлены акцыі спіса № 1 акцыянерных таварыстваў адкрытага тыпу, створаных у працэсе прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці, акцыі якіх рэалізоўваліся за чэкі «Маёмасць» праз Ашчадбанк.

Па словах начальніка ўпраўлення Міндзяржмаёмасці Віктара Гарэцкага, ёсць надзея, што рэалізацыя акцый праз біржу пачнецца ўжо ў верасні гэтага года.

Ірына САЗАНОВІЧ, БелаПАН.

ЦІ ВЫЙДЗЕ ТРАНСПАРТНАЯ ГАЛІНА З КРЫЗІСУ?

Калегія Міністэрства транспарту і камунікацый рэспублікі абмеркавала выкананне праграмы па выхаду галіны з крызісу.

Транспартная галіна рэспублікі перажывае вельмі складаны час. Аб'ём перавозак грузаў чыгуначным транспартам у параўнанні з 1990 годам склаў 34 працэнты, аўтамабільным агульнага карыстання — 28 працэнтаў. У сёлетнюю навігацыю перавозкі па ўнутраных водных шляхах рэспублікі практычна спынены. Як вывесці галіну з зацяжнога эканамічнага крызісу — аб гэтым ішла гаворка на калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый, якая абмеркавала таксама вынікі работы аб'яднанняў і прадпрыемстваў за паўгоддзе і захады па паляпшэнню іх дзейнасці, фінансаваму аздараўленню, зніжэнню выдаткаў вытворчасці. Стратэгічнай мэтай скаардынаванай транспартнай палітыкі, як адзначалася на калегіі, павінна стаць стварэнне высокаэфектыўных нацыянальных тавараватворчых і пасажыраабслугоўваючых транспартных сістэм, інтэграцыя транспартнага комплексу рэспублікі ў еўрапейскую і сусветную сістэмы. Зыходзячы з гэтых задач, у рэспубліцы распрацаваны праграмы асобных накірункаў развіцця транспарту. З вялікімі цяжкасцямі з-за недахопу інвестыцый, у тым ліку бюджэтных, ажыццяўляецца рэспубліканская праграма развіцця пасажырскага транспарту. Плануецца пачаць ажыццяўленне нацыянальнай праграмы «Тэрмінал», якой прадугледжваецца стварэнне сістэмы транспартнага абслугоўвання ў новых умовах. Міністэрства транспарту і камунікацый рэспублікі распачало таксама распрацоўку комплекснай праграмы развіцця транспарту. І, як адзначалася на калегіі, гэтая праграма павінна стаць адной з прыярытэтных дзяржаўных праграм.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

ЯК ПРАЦУЕ ПАЛІЎНА-ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ?

У Міністэрстве паліва і энергетыкі сталі вядомы вынікі работы паліўна-энергетычнай гаспадаркі Беларусі ў чэрвені і ў другім квартале гэтага года. У прыватнасці, выпрацоўка электраэнергіі ў чэрвені склала 1 мільярд 427 мільёнаў кВт-гадзін, ці 64,12 працэнта ад чэрвеньскага паказчыка 1994 года; у другім квартале — 5 мільярдаў 152 мільёны кВт-гадзін, ці 74,2 працэнта ад адпаведнага перыяду мінулага года. Аб'ём выпрацаванай у рэспубліцы электраэнергіі (каля 65 працэнтаў усёй ужытай) у значнай ступені адлюстроўвае патрэбы вытворчасці, якія паменшыліся з-за агульнага спаду.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ, БелаПАН.

СИТУАЦИЯ



ОСТАТКИ БЫЛОЙ РОСКОШИ

Фото Юрия ЗАХАРОВА.

ВНИМАНИЕ: ПРОБЛЕМА!

СПАСАТЬ ЖИВЫХ ИЛИ ЛИШЬ ВЫТАСКИВАТЬ МЕРТВЫХ?

ЕЩЕ РАЗ О НЕОБХОДИМОСТИ СЕРЬЕЗНОГО ПОДХОДА К ОРГАНИЗАЦИИ СЛУЖБЫ СПАСЕНИЯ НА ВОДЕ

Вячеслав ШИХМАРЕВ, заместитель прокурора Центрального района Минска.

Год назад в республиканской прессе была опубликована моя статья «Спасай себя сам, когда тонешь». В ней говорилось о серьезных недостатках в организации спасательной службы на воде в рамках ОСВОДа, что ведет к гибели людей. Высказывал пожелание о придании этому делу государственного статуса вместо нынешнего общественного, исчерпавшего, как я убежден, свои возможности.

Помнится, та статья вызвала недовольство некоторых работников ОСВОДа, расценивших ее как предвзятую. Один из них, весьма уважаемый человек, даже грозился подать на меня в суд, требуя официального опровержения фактов, якобы дискредитирующих его как добросовестного и принципиального работника. Впрочем, судиться воздержался, видимо, прикинув несостоятельность своих претензий. Да и вряд ли что получилось бы из этой затеи. Я ведь тогда еще и не все сказал. К тому же совсем не преследовал цель наступить «на мозоль» конкретному человеку. Нет, проблему надо понимать гораздо шире — необходимо коренным образом реорганизовать спасательное дело на воде. Сегодняшняя ситуация просто обязывает вновь вернуться к прежнему разговору.

Проблема гибели людей на воде для Центрального района Минска, на территории которого находятся два общегородских места массового отдыха — Комсомольское озеро и водохранилище «Дрозды», не нова. Но никогда она еще не была так остра, как в два последних жарких лета. Понятно стремление людей снять усталость от зноя у прохладного водоема. В условиях дороговизны, недоступности для многих отдыха на берегу моря, наши реки, озера являются чуть ли не последней отрадой.

А как же организована служба обеспечения безопасности на воде? Вновь заявляю со всей ответственностью — далеко не надлежащим образом. Основания для такого утверждения содержатся в материалах прокурорских проверок.

За прошедший купальный сезон на этих водоемах, несмотря на существование на них стационарных спасательных станций, погибло 16 человек, включая двух детей. В этом году только на пик летнего сезона уже зарегистрировано 12 несчастных случаев со смертельным исходом. Гибнут в подавляющем большинстве люди самого цветущего возраста — 20-30 лет. Если ничего в экстренном порядке не изменить, то к осени число погибших может значительно возрасти. А ведь за каждым таким случаем невыразимое горе и страдания родных и близких. Если несчастный случай, скажем, на производстве со смертельным исходом является чрезвычайным происшествием, связанным с целым комплексом мероприятий по предотвращению подобного впредь, наказанием виновных и так далее, то смерть человека на воде почему-то воспринимается весьма обыденно, почти незаметно, в том числе и людьми, призванными в силу своего профессионального предназначения препятствовать этому. Скорее, принимается как неизбежная естественная убыль без серьезных попыток что-либо изменить на будущее. А ведь по сути и там, и здесь результат равнозначный — утрата человеком самого дорогого — жизни.

В прошлые годы в условиях сравнительно прохладного лета плохая работа спасателей была не так заметна, т.к. число погибших на воде было в 2-4 раза меньше нынешнего, что давало некоторую возможность объяснить собственную безответственность личной неосторожностью пострадавших. Два последних необычно жарких купальных сезона, как лакмусовая бумажка, обозначили несостоятельность спасательной службы в целом, которую просто несет в прямом и переносном смысле по течению при полном нежелании или неумении изменить ситуацию.

Почему это происходит? Думается, не в последнюю очередь из-за организационных неурядиц. Ранее работой спасательных станций руководил председатель райсовета ОСВОДа, который нес за них персональную ответственность. Теперь же, оставаясь, в принципе, координатором и организатором спасательного дела на воде, он лишен возможности влиять на положение дел на этих станциях из-за переподчинения их непосредственно Мингорсовету ОСВОДа на правах самостоятельной службы. Председатель же райсовета сосредотачивается исключительно на профилактической работе по типу чтения лекций о пагубности купания в неположенных местах и т.п. Словом, генерал без войска. Ну, а, как водится, у семи нянек дитя сирота. Видно, не добираются на спасательные станции ни районные, ни городские службы, оставляя все на откуп ее работникам. А контролировать-то есть кого. На спасательных станциях сосредоточен далеко не лучший контингент. Достаточно там бездельников и выпивох, ищущих романтики и безмятежного времяпрепровождения на лоне природы под ласкающими лучами солнца.

Много людей гибнет в непосредственной близости от спасательных станций, буквально на глазах спасателей. Тем не менее, пытаются спасать терпящих бедствие преимущественно друзья и родственники, иногда с риском для собственной жизни, в условиях полной неподготовленности к подобного рода деятельности. На их долю чаще всего выпадает и печальная функция извлечения из воды тех, кому помощь уже не нужна.

А что же спасатели, спросите вы? Они, как показывают материалы проверок, часто позволяют себе появляться на месте происшествия даже не в последний момент, а значительно позже, когда в их экстренных услугах уже отпадает необходимость. Причем, случается, в таком непотребном от употребления спиртного виде, что в воду лезть не рискуют, поскольку их самих впору спасать.

Как явствует из материала проверки по факту гибели 18.07.94 года на водохранилище «Дрозды» И.Гриневицкого, он утонул в зоне видимости тамошней спасательной станции. Но изрядно выпившие спасатели прибыли лишь тогда, когда друзья покойного, обессилев, не смогли за ним больше нырять. За Гриневицким нырнул только один из них, и то единственный раз, заявив, что больше этого делать не будет — глубоко. На попытку одного из друзей погибшего, продолжавшего поиски, пристыдить их и вернуть к исполнению служебных обязанностей бравые спасатели отреагировали своеобразно: несколько раз легонько притопили его из лодки, для большей убедительности пристукнув головой о борт, после чего удалились. Приблизительно такая же история произошла летом прошлого года на этом же водоеме — утонул М.Клусевич.

6 июня 1995 года во время купания на Комсомольском озере утонул Д.Гуляй. Когда возможности достать его тело из воды были исчерпаны, друзья утонувшего обратились за помощью на спасательную станцию. Потом ее начальник Куксов Михаил Николаевич в бравурном тоне доложил прокуратуре, что по поступлении сигнала о бедствии катер со спасателями сразу выбыл на место происшествия, они сразу приняли меры к отысканию трупа, поиски которого положительного результата не дали. Это совсем не вяжется с тем, что сообщили очевидцы трагедии. Оказывается, узнав о том, что с момента трагедии прошло некоторое время, спасатели вообще отказались следовать на место и сделали это лишь после настойчивых требований друзей погибшего. По прибытии к месту водолаз в полном снаряжении около 10 минут побродил для видимости по грудь по мелководью, после чего отбыл, заявив, что один без подстраховки погружаться не имеет права, как будто люди были виноваты в том, что наряд выбыл на место не в полном составе! Труп был извлечен спустя 30 минут, благодаря усилиям возобновивших поиски друзей.

И совсем дикий случай произошел 19 июня этого года на Комсомольском озере, когда группе явно нетрезвых молодых людей сами спасатели предоставили лодку для экскурсии на ближний остров — продолжать пьянку. Во время следования к острову Анатолий Гуринович бросился в воду за уроненным веслом и стал тонуть. На помощь к нему устремился Игорь Рудаков, который сам стал погружаться под воду. Все происходило буквально под носом у спасателей, которые и на этот раз умудрились опоздать, так как на их моторке, как на грех, не оказалось ключей, аккумулятора и бензина. Стараниями приятелей Рудаков был спасен, а Гуринович ушел под воду и погиб.

Спрашивается, кому нужна подобная спасательная команда? А ведь они получают деньги, хоть и не весьма большие. Так не лучше ли создать действительно дееспособную, достаточно оплачиваемую государственную спасательную службу, за которую бы люди держались и на которую человек мог бы положиться в трудную минуту. Есть же такие службы на производстве по примеру горноспасателей или газоспасателей. Или и дальше будем экономить на жизни людей, отдавая дело первостепенной важности общественной организации с ее объективно ограниченными возможностями? И дальше будем иметь дело со спасательной службой, сфера приложения усилий которой будет преимущественно ограничиваться извлечением трупов из воды, нежели оказанием помощи тем, кому она нужна при жизни. Но ведь человеческая жизнь дорого стоит, а точнее — бесценна.

Не хочу представлять проблему однобоко. Далеко не все зависит от спасателей, какими бы профессионалами они ни были. Практика свидетельствует, что трагедиям на воде, за редким исключением, предшествовало грубое игнорирование пострадавшими элементарных правил поведения на воде. Практически все несчастные случаи однотипны до предела: пришли на озеро отдохнуть, выпили спиртного, полезли в воду. Не заметили, как один утонул, или заметили слишком поздно.

Для студента Лингвистического университета Дмитрия Минюкевича, отмеченный 5 июня 1995 года с выпивкой на Комсомольском озере день рождения, к несчастью, стал последним в его жизни. А ведь все могло быть иначе...

РОССИЙСКИЕ ВЕСТИ

ПАДАЕТ ДОБЫЧА НЕФТИ И ГАЗА

